## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.36 | 16.11 | 8.35 |
| Віцебск — | 7.31 | 15.56 | 8.25 |
| Магілёў — | 7.26 | 16.02 | 8.36 |
| Гомель — | 7.17 | 16.04 | 8.47 |
| Гродна — | 7.50 | 16.27 | 8.37 |
| Брэст — | 7.45 | 16.34 | 8.49 |

### Месяц

*Першая квадра 18 лістапада. Месяц у сузор'і Вадалея.*

### Імяніны

***Пр.** Канстанціна;*
***К.** Амеліі, Марыі, Альберта, Артура, Леапольда.*

## НАДВОР'Е на заўтра




— слабая геамагнітная бура
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

| 2 гадз. | 5 гадз. | 8 гадз. | 11 гадз. | 14 гадз. | 17 гадз. | 20 гадз. | 23 гадз. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

## ...у суседзяў

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА | 0..+2°С |
| КІЕЎ | 0..+2°С |
| РЫГА | +1..+3°С |
| ВІЛЬНЮС | -3..-1°С |
| МАСКВА | -5..-3°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | 0..+2°С |

## Дзве даты

### 15 лістапада

**Сёння — Сусветны дзень філасофіі.** Адзначаецца штогод у трэці чацвер лістапада.

**1812 год** — у ходзе Айчыннай вайны адбылася Койданаўская бітва, у выніку якой рускія войскі пад камандаваннем адмірала П. Чычагава адрэзалі прамую дарогу на захад адступаючай арміі Напалеона. Перадавы атрад генерала К. Ламберта, сутыкнуўшыся з 5-тысячным французскім атрадам, акружыў і разбіў яго. У палон былі захоплены 3 тысячы салдат і 65 афіцэраў непрыяцельскага войска.



**1492 год** — Хрыстафор Калумб упершыню апісаў у сваім дзённіку тытунь. Па іроніі лёсу (а можа і не), менавіта сёння адзначаецца сусветны дзень адмовы ад курэння.

## Цытата дня:

***«Мы на многае не адважваемся не таму, што яно цяжкае; яно цяжкае менавіта таму, што мы на яго не адважваемся».***

**Сенека (4 да н.э. — 65 н.э.), рымскі палітычны дзеяч, філосаф і пісьменнік.**



**Віншуем з днём нараджэння Фёдара Фёдаравіча МАХОНЬКУ.
Хай твая зорка гарыць ярчэй за ўсе,
моцнага табе здароўя, сынок.
Бацькі.**

## Усміхнёмся!

Настаўніца на бацькоўскім сходзе:
— З-за Васявых доследаў пацярпеў увесь клас!
— Я вас разумею!
— Даруйце, вы Васяў тата?
— Не, Васевы бацькі эвакуіраваныя з горада, я іх сямейны сапёр...

☺

**Чакаеце важнага званка і ніяк не можаце дачакацца? Пакладзіце мабільны тэлефон у самую дальнюю кішэню, ідзіце ў ванную і намыльце рукі.**

☺

З перапіскі на сайце знаёмстваў.
— Марына... Якое прыгожае імя!
— Дзякуй!
— Гэта нешта марское ці звязана з агуркамі?




Анатоль ЯРМОЛЕНКА:

# «НЕ ЦЯРПЛЮ ФАЛЬШУ»




**Напэўна, у гэты вечар ён скажа прыкладна так: «Сёння ў нашай хаце свята, калі ласка ў нашу хату...» І людзі прыйдуць, каб павіншаваць Янатоля Ярмоленку з 60-годдзем, якое ён адзначыць 15 лістапада на сцэне Палаца Рэспублікі. Як гаспадар, ён збірае гасцей — артыстаў, з якімі давялося сустрэцца, калі абраў сваю дарогу да слухачоў. Менавіта пра «яго дарогу» можна будзе даведацца ў гэты вечар з першых вуснаў. Пра вецер і камяні, якія могуць прымусіць спатыкацца, пра страты і надзеі, якія ёсць у кожнага чалавека. Не кожны толькі пра ўсё гэта можа праспяваць у песні, якая спецыяльна напісана да гэтага канцэрта і для гэтага чалавека. Не кожны можа спяваючы прызнацца: «Мая дарога побач з вамі»...**

— У мяне ёсць задума паказаць свой шлях, — **гаворыць Анатоль Іванавіч**. — Ён аказаўся не толькі доўгі, але і цікавы: мне пашчасціла сустрэцца з вялікімі зоркамі! Можа іх імёны сёння многім нічога не гавораць. А я некалі заслухваўся па радыё песнямі Марка Бернэса, Уцёсава, Клаўдзіі Шульжэнкі, Трошына, потым Магамаева. Калі я дваццацігадовым юнаком бачыў іх на сцэне, у мяне перахоплівала дыханне. Калі шчасціла працаваць у адных праграмах, я вучыўся ў іх. За сцэнай яны былі звычайнымі, ужо вельмі не маладымі людзьмі, але калі выходзілі на сцэну — Богі, профі. Адзін рух — і яны забывалі, колькі ім гадоў, умелі трымаць залу. Што значыць асоба, што значыць прафесіяналізм, я зразумеў каля іх.

Я хачу, каб людзі памяталі не толькі тыя песні, якія я спяваю, але нагадаю тыя, якія сам вельмі любіў, пад якія мне давялося сталець. Калі мяне забралі ад мамкі ў армію, павезлі ў Баку, аднойчы я стаяў салдацікам на пасту і раптам пачуў: «Ты мне вчера сказала, что позвонишь сегодня...» Песня Палада Бюль-Бюль Аглы. Я патэлефанаваў яму, запрасіў на канцэрт. Потым мы сустрэліся ў Доме афіцэраў і ён сказаў: «Толя, я ўсё кіну і абавязкова прыеду». А ён жа цяпер працуе паслом Азербайджана...

Пасля Баку я паехаў на гастролі, і разам з намі тады Саша Буйноў іграў на клавішных, мы з ім перапявалі «Бітлз»... Зараз таксама разам спяём. Прыедзе з Германіі Тухманаў, песні якога мне пашчасціла выконваць. Мой сябра Лёва Лешчанка рыхтуе нейкі сюрпрыз. А Дэміс Русас, мой кумір!.. Я памятаю, якімі папулярнымі былі яго песні, і мне самому хацелася б праспяваць: «Гуд бай, май лав, гудбай», «Сувенір». А цяпер мая мара збудзецца — мы будзем спяваць разам. Прыедзе Верка Сярдзючка, і мне прыемна, што маладыя артысты адносяцца да мяне з павагай як да майстра. «J:mors» хочуць зрабіць песню «Жывая вада» з нашага другога альбома. Мне хацелася б, каб атрымаўся такі канцэрт па цеплыні і шчырасці, якіх яшчэ не было ў Беларусі. Я ўдзячны АНТ за дапамогу ў яго арганізацыі.

**— Многім збоку здавалася, што ваша дарога ішла лёгка і кар'ера складвалася гладка. А ці былі моманты, калі вам даводзілася ісці насуперак чамусьці?**

— Я скажу так: магчыма, дзякуючы таму, што насуперак, удаецца працаваць так паспяхова. Спатыкнешся, ці нават стомішся, дык ужо некаторыя паціраюць рукі, рыхтуючыся заняць тваё месца... Але пакуль ёсць здароўе, пакуль Бог дапамагае, падтрымлівае сям'я, «Сябры», пакуль ёсць сябры і прыхільнікі, шмат задум і планаў, я гатовы рабіць, рабіць, рабіць... І не не магу заспакойвацца. У мяне шмат ідэй, усе нават стамляюцца ад іх. Але ў мяне хапае характару і сілы іх увасабляць. Насуперак розным праблемам. У жыцці без іх не абыходзілася.

Спачатку нас хацелі расфарміраваць. Гаварылі, маўляў, ужо ёсць «Песняры», «Верасы», навошта яшчэ адзін эстрадны беларускі калектыў? Прапаноўвалі зрабіць з нас дыксіленд. Але потым мы паехалі ў Маскву, спелі там песню «Алеся», якую спецыяльна для нас напісалі. Гэта пайшло на ўсю краіну па тэлебачанні і для многіх было нечаканасцю. І вось так нас пастаянна адкрывалі: глядзіце, а здаецца, што ў вас атрымліваецца... Потым быццам бы прызналі, але спатрэбілася столькі гадоў! 33 гады працуе калектыў — узрост паказальны. А я ўжо 40 гадоў на эстрадзе. Я ўжо шмат ведаю пра гэты свет. Усю эстраду — нашу, савецкую і замежную — ведаю цудоўна, разумею, што на чым трымаецца. І калі мне пачынаюць распавядаць, хто тут зоркі якой велічыні, я цудоўна магу вызначыць іх рэальнае месца. Мне з аднаго боку прасцей, а з другога складаней — я бачу, чаго сапраўды варты той ці іншы выканаўца, той ці іншы калектыў. Таму стараюся трымаць сваю планку.

**— Былі моманты, калі вас спрабавалі «закруціць»?**

— Безумоўна. А ці зараз не хацелі б? Толькі зараз ужо мяне «закруціць» складана.

**— Адчуваюць аўтарытэт народнага артыста Беларусі?**

— Магчыма. Але я не баюся, калі мяне падпіраюць творча. Мяне гэта толькі радуе. Насамрэч я не магу зразумець і прыняць, калі нехта хоча проста махнуць рукой: ведаем, бачылі... У нас сёння вялізнае поле дзейнасці. У нас вялікая аўдыторыя і ў Беларусі, і ў Расіі, і ва Украіне. Нават у далёкім замежжы ёсць прыхільнікі — у Амерыцы жывуць людзі, якія любяць нашы песні. Што, вы думаеце, у мяне не было магчымасцяў «зваліць» туды, дзе добра плацяць? Цяпер жа так і робяць: трошкі падымецца артыст, адна песня больш-менш добра пайшла, адразу гатовы аддацца любой з сумежных дзяржаў. Я мог бы ў кожнай з суседніх краін цудоўна сябе адчуваць, зарабляць, не нервавацца, проста «касіць» грошы, як цяпер гавораць. Але не стаў гэтага рабіць і не буду, у мяне іншы стан душы. Я ўсведамляю меру адказнасці за тое, што на мяне ўскладзена сёння роля старэйшыны нашага цэху. Мне хочацца, каб тут разумелі, што такое ўзровень. Вось мы далі канцэрт выхаванцаў студыі «Сябры», летась была праграма Алесі «Разам са сваёй краінай». Гэта крэда не толькі маё і ансамбля, але цяпер і дзяцей маіх, якія працуюць у ім. Алеся ўжо 15 гадоў на сцэне. Здаецца, не так даўно дзяўчом пачынала, толькі дванаццаць гадоў было, калі яна ўпершыню з намі выйшла на сцэну. Але як вырасла! Каб нечага дасягнуць, мала адной песні, трэба каб адзін шлягер змяняўся другім, яшчэ лепшым, які б спявала ўся краіна.

**— Папулярнасць — капрызная рэч, асабліва сёння, калі шмат што вызначаецца магічным словам «фармат». Здаецца, вы пра яго зусім і не думаеце, і пры гэтым застаяцеся на вышыні. Як гэта ў вас атрымліваецца?**

— Ёсць фармат «Сяброў». Не кожнаму дадзена працаваць у гэтым фармаце, не кожны змог бы пакараць аўдыторыю без залішніх і навязлівых радыёэфіраў. Паказчык — канцэрты, на якія людзі прыходзяць. Ведаеце, я некуды ўвесь час упрагаюся. Здавалася б, можна нешта зрабіць і заспакоіцца. Калі мы 30-годдзе «Сяброў» адзначалі, я думаў: вось толькі б адзначыць годна, вызначылі планку для сябе... І атрымалі падзякі на ўсіх узроўнях, і самых высокіх таксама. Адзначылі сваю круглую дату ў Крамлёўскім палацы. Думаў, ужо хопіць з нас. Потым зразумелі, што патэнцыял у «Сяброў» ёсць, глядач нас любіць. На наступны год мы правялі добры гастрольны тур з гэтай праграмай. У Маскве заклалі нашу «зорку». Але і на гэтым не спыніліся. Сёлета ў нас ізноў тур — мы зрабілі праграму «Ад «Алесі» да Алесі». Яна вельмі паказальная — сведчыць пра пераемнасць нашай песеннай культуры. Прыемна, што гэта адчуваюць не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах. Публіка, якая ведае нас, з задавальненнем прыходзіць на канцэрты і праз нас сённяшніх даведваецца пра цяперашнюю Беларусь.

**— Анатоль Іванавіч, мы штосьці ўвесь час гаворым пра калектыў, але ёсць ваша асабістая папулярнасць — заўсёды ж глядзяць на лідара. Ёсць прыхільнікі, напэўна, і прыхільніцы... А тут можа быць столькі спакусаў. Што дапамагала вам годна несці сваю папулярнасць?**

— Я не звяртаю ўвагі на такія рэчы, а проста працую. Ведаю, што нельга спыняцца і існаваць у задаволеным стане. Адзін раз зрабіўшы, не пратрымаешся на плыву столькі гадоў, калі пастаянна не будзеш знаходзіцца ў форме, у працы. Вось даў жа Бог сілы! Калі б я толькі сабой займаўся... Але ж за мной яшчэ і калектыў. Прыходзіцца займацца літаральна ўсім — і творчымі пытаннямі, і арганізацыйнымі. Скажу так: мужчына павінен заўсёды здужаць усё.

**— Калі побач з ім добрая жанчына... Вам з жонкай пашчасціла?**

— Я думаю, што пашчасціла і жанчыне, якая са мной... Канешне, лёс ведае, куды нас вядзе, трэба яму давяраць. Я ўсё жыццё пражыў з адной жонкай. Хоць са мной вельмі складана: у мяне своеасаблівы характар, вельмі мэтанакіраваны. Каб быць са мной побач, трэба ўмець перабароць сябе. Са мной не проста ўсім — сябрам, жонцы, дзецям. Таму што я вельмі патрабавальны.

**— А збоку здаецца, што вы такі клапатлівы тата...**

— Я сапраўды клапатлівы тата. Я вельмі люблю сына і дачку, люблю ўнукаў. Але люблю — не значыць патакаю. Наадварот, я выхаваны так, што для сваіх дзяцей паставіў высокую планку. Я ніколі не буду цягнуць за вушы тое, што ніжэй за маю адзнаку. Цудоўна ведаю, як глядзяць на гэта, ведаю, як такія моманты абмяркоўваюцца, нават сярод сяброў, знаёмых. Ва ўсіх ёсць дзеці, усе могуць быць таленавітымі, хочуць сябе праявіць. Але не ўсім, магчыма, хапае працавітасці, настырнасці, жадання. Не думайце, што маім дзецям прыйшлося лёгка. Перш, чым яны выйшлі на сцэну, была вялікая праца — у сям'і, дома.

**— Вы належыце да тых рэдкіх артыстаў, якія не ўцякаюць ад сям'і на гастролі, а наадварот, ахвотна бераце сям'ю з сабой. Разам весялей?**

— Так склалася, што сям'я працуе разам са мной. Што б мне ні гаварылі, самыя надзейныя людзі — гэта члены сям'і. Яны не здрадзяць. Яны не трымаюць камень за пазухай. Яны заўсёды падстаўляць сваё плячо. Яны шчыра любяць і паважаюць. У іх няма пачуцця зайздрасці поспехам. На іх можна разлічваць у любых сітуацыях. Сёння мы перажываем вельмі складаны час, калі ў сем'ях часта здраджваюць з-за нейкіх матэрыяльных здабыткаў. Канешне, сям'я павінна быць здаровай. Мне ў гэтым сэнсе пашчасціла. І выхавалі мяне так, што ў сям'і ўдаецца трымаць баланс. Мае блізкія служаць адной справе. Не вельмі я гэтага хацеў, нікога не цягнуў, яны самі да гэтага прыйшлі, праявілі сябе. І «Сябры» — гэта асаблівая супольнасць, у ёй мне ўсе людзі блізкія — родныя і сябры. Я ўдзячны Мікалаю Сацуры, з якім працую разам 33 гады. Чалавек, які ў самыя цяжкія часы падстаўляў плячо. І я ніколі яму не здраджу. Былі ў нас розныя моманты, калі, так бы мовіць, ішла праверка... Не так даўно быў складаны перыяд, калі людзей спрабавалі перацягнуць на лепшыя ўмовы. Ніхто не павёўся на гэта. Менавіта духам сяброўскім мы жывыя. Мы ж самі на сябе зарабляем, ні ад каго не залежым.

**— Назва ансамбля «Сябры» зрабіла вас блізкім для многіх людзей. Ці часта да вас набіваліся ў сябры? І ці ёсць людзі, сяброўства з якімі вам дарагое?**

— Я вельмі асцярожны ў выбары сяброў. У мяне ёсць некалькі добрых сяброў, якія не маюць адносінаў да сцэны. У мяне ёсць цудоўныя сябры будаўнікі, я вельмі цаню іх меркаванне. У мяне ёсць кантакты з нашымі касманаўтамі — беларускімі і расійскімі. Я вельмі многа выступаў у «Зорным гарадку», на 40-годдзе быў туды запрошаны. Мы з Алесяй былі адзінымі артыстамі, каго запрасіў на юбілей Пётр Клімук. Я вельмі цаню меркаванне такіх людзей, як Аляксей Дудараў і Аляксандр Яфрэмаў. Валодзя Гасцюхін заўсёды мне патэлефануе, дзе б ні здымаўся: «Бачыў, Толя, тваю праграму, быццам бы дома пабываў...» І цёпла на сэрцы ад яго слоў. Сапраўды, слова «сябры» вельмі ёмістае. Калі мы толькі арганізаваліся, у мяне ўзнікла ідэя назваць калектыў так, каб дух сяброўства перадаваць іншым. І гэта спрацавала. Дзякуй Богу, нам хапае таленту, вопыту і працавітасці, каб не расчароўваць тых, хто лічыць нас сваімі сябрамі. Ведаеце, такія людзі ёсць нават у Кітаі — вельмі прыемна, калі мы едзем туды, і там нас ведаюць, нават імкнуцца нам падпяваць!

**— Няўжо па-беларуску?.. Дарэчы, вы таксама спрыялі таму, каб былі папулярнымі беларускія песні. Ці запатрабаваныя яны сёння ў вашых канцэртах за мяжой?**

— Калі мы пачыналі, у нашым рэпертуары былі беларускія песні, якія станавіліся неверагодна папулярнымі. Тая ж «Лягу прылягу», «Гуляць дык гуляць», ці песні Ігара Лучанка, якія мы спявалі. «Запатрабаваныя» — нават не тое слова. З намі спявала ўся зала!.. У нас з самага пачатку былі песні як на рускай, так і на беларускай мове, і цяпер мы складаем нашы праграмы з песень на дзвюх мовах. Я не прыхільнік пазіцыі «няхай дрэннае, але на беларускай мове». Я за добрыя песні на беларускай мове. Тым больш, сам валодаю беларускай мовай, імкнуся на канцэртах прадстаўляць песні па-беларуску. Нават у Расіі, бывае, пасля нейкай песні аўтаматычна працягваю весці праграму па-беларуску, а мне крычаць: «Ды мы разумеем!» Галоўнае — нас разумеюць.

**— Вы выйгравалі на фоне савецкіх артыстаў, якія ў вялікіх канцэртах былі ў асноўным гладка паголеныя, роўненька прычасаныя, пры гальштуку. Вы ўсё рабілі наадварот, абраўшы імідж, як цяпер сказалі б, «мачо». Хто вам яго падказаў?**

— Мая жонка была мадэльерам-цырульнікам, яна потым стала ў «Сябрах» касцюмерам. У Раісы добры густ. Калі мы пазнаёміліся, яна была вельмі прыгожай дзяўчынай, цяпер бы сказалі «стылёвай». Яна падказвала нейкія ідэі, мы збіраліся, абмяркоўвалі іх, увасаблялі. Пашылі стылізаваныя касцюмы, паступова акрэсліўся наш вобраз на сцэне. Але нельга сказаць, што мы не мяняемся. Трэба трошкі мяняцца. Калі хто ўважліва сочыць, то заўважыў, што ў мяне прычоска ўжо не такая як раней. Усё сумняваюся, галіць бараду, ці не... Чаму б не з'явіцца перад публікай у нечаканым выглядзе? Праўда, пакуль не рашаюся. Магчыма, на наступны юбілей... Але ўвогуле трэба быць заўсёды сучасным. Не модным, таму што мода праходзіць. У любы час, у любую эпоху і дзесяцігоддзе трэба найперш быць самім сабой, каб не выглядаць смешным. Я не магу глядзець на мужчын, якія падфарбаваныя, напамажаныя. Не асуджаю іх — кожны мае права на самавыражэнне. Але мужчына прыцягвае сваім унутраным станам, характарам, розумам. І не важна, малады ён ці сівы.

**— У вас выраслі дзеці, пакуль вы працавалі, цяпер растуць унукі, і вы таксама шмат працуеце. Ці змаглі вы стаць дзядулем больш уважлівым, чым былі бацькам?**

— На жаль, не. Я думаў, што я буду добрым дзядулем, таму што дзецям я не дадаў увагі. Зараз я вельмі сябрую з унучкай і ўнукам. Але ўнук расце пры мне. А дачка сына больш знаходзіцца з бацькамі маці. Там іншыя інтарэсы, норавы, законы. Не зусім я магу іх прыняць. Анатоля я вучу, выхоўваю, накіроўваю. Я хачу, каб ён быў прыстойным чалавекам, моцным, які ўмее разважаць. Я кажу, што перш, чым нешта зрабіць, трэба падумаць. Ён так і робіць: перш, чым узяць цацку, падумае, ці патрэбна яна яму зараз. Ён здольны хлопчык, я думаю, на маёй вечарыне ён сябе пакажа. Мне хацелася б, каб ён выступіў. А ён кажа: «Калі буду гатовы. Там жа такія артысты будуць! Калі я не здолею, Толя, не прымушай мяне, я ж не магу быць горшым за цябе...» Мне гэта падабаецца.

**— Якая рыса характару вам найбольш дапамагала ў жыцці і складае аснову вашага характару?**

— Я не хачу гаварыць, якая ў мяне рыса добрая, якая дрэнная. Я такі, які ёсць. У мяне ёсць і адмоўныя рысы. Але я не цярплю фальшу. І я магу дазволіць сабе не кантактаваць з людзьмі, на любым узроўні, калі адчуваю, што яны не ва ўсім шчырыя. Магу дазволіць сабе не прыходзіць да іх, не прыніжацца, не прасіць ні аб чым. Я прывык разлічваць найперш на сябе.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# «ВЯСНА-ЛЕТА 2008»

Сёння, 15 лістапада, у Мінску закончыцца чарговы Тыдзень моды «Вясна-лета 2008». Прайшлі не толькі паказы беларускіх дызайнераў і вытворцаў. Упершыню ў гісторыі Тыдня моды праводзіўся конкурс дзелавога касцюма. Свае калекцыі прадставілі адзінаццаць прадпрыемстваў з усёй краіны. Магчыма, ужо гэтай вясной мы пабачым усе калекцыі конкурсу на прылаўках.

Кожны вечар праходзілі паказы аўтарскіх калекцый беларускіх дызайнераў — Андрэя Варашкевіча, Алены Цакаленкі, Анжэлікі Папроцкай, Андрэя Вітко і іншых.












Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## «ПСІХАТРОПНЫ ТРЭСТ» ЛОПНУЎ

**Сталічныя міліцыянеры перакрылі канал пастаўкі ў Мінск псіхатропных рэчываў МДМА.**

Паводле звестак ГУУС Мінгарвыканкама, трое гандляроў «кайфам» былі затрыманы ў Брэсцкай вобласці падчас рэалізацыі 90 таблетак. Пры аглядзе аўтамабіля, у якім адбываўся гэты «гешэфт», міліцыянеры выявілі ў бензабаку тайнік, дзе захоўвалася яшчэ 30 таблетак МДМА. Неўзабаве былі затрыманы іншыя ўдзельнікі гэтага «псіхатропнага трэста». Усяго зараз за кратамі знаходзяцца 7 пастаўшчыкоў «кайфу». Як падкрэслілі ў сталічным ГУУС, гэтым крымінальным бізнэсам займаліся маладыя асобы ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў. Некаторыя з іх нідзе не працавалі, іншыя былі навучэнцамі. Псіхатропныя рэчывы яны набывалі ў Польшчы па 3 долары за 1 таблетку, у Беларусь увозілі у спецыяльна абсталяваным у аўтамабілі тайніку. Рэалізоўвалі МДМА па цане 15 доларaў за таблетку на тэрыторыі Брэсцкай вобласці і ў Мінску, у месцах масавага адпачынку моладзі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## МАРЫХУАНУ ВЫРОШЧВАЎ НА АГАРОДЗЕ

Буйную партыю марыхуаны знайшлі супрацоўнікі міліцыі ў кватэры непрацуючага брастаўчаніна. Шэсць кілаграмаў зелля былі расфасаваныя ў пакецікі і падрыхтаваныя да рэалізацыі. Агульны кошт партыі ацэньваецца прыкладна ў 15 тысяч долараў. А вырасціў гэту атруту гараджанін на прысядзібным участку сваёй бабулі.

**Яна СВЕТАВА.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.347. Індэкс 63850. Зак. № 6222. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12